ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

15 СЬНЕЖНЯ 1931 г. №306 (1557)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ



Насустрач трэцяй бальшавіцкай *

...тар і сельгасмашына ўпіса-...лну слаўную старонку ў гіс-...другой бальшавіцкай вясны ...няга севу на саўгасных і ...ых палёх Беларусі. Павы-... ўраджайнасьці на дзесятках ...га саўгасных і колгасных ...апрацаваных МТС, паказала ...ктыцы масам працоўнага ся-...я, якое велізарнае значэньне ... трактар і сельгасмашына ...будове на соцыялістычны лад ..., расьпыленай сялянскай гас-...

..., абязьлічка і безгаспадарчыя ...ы да трактара і сельгасма-...ў многіх саўгасах, колгасах ...ышчэ ня выкарчаваны.

...ыя паставіла перад намі за-...узьняць ураджайнасьць на ...е організацыйна-гаспадарча-...ацаваньня колгасаў. У ба-... за павышэньне ўраджайнас-...ную ролю павінны адыграць ... і тэмпы палявых работ. Зра-... што вырашыць гэтыя зада-...зе цяжка, калі спазьніцца з ...ам трактароў і сельгасма-...Адмоўныя ўрокі мінулага го-...рава гэта паказалі. Запазда-...рэнны рамонт трактароў і ...машын у першыя дні ўдар-...боты на полі прывёў к таму, ...мат іх выходзіла са строю, ...чнай меры з-за гэтага рась-...ся тэрміны сяўбы. Вось ча-...шым баявым маршрутам у ...ктоўцы да трэцяй бальшавіц-...ены комсамол павінен высу-...падрыхтоўку трактарнага і ...нага парку.

...гія НКЗБ вынесла пастанову ...е якое ўсе трактары, прычэп ...інвэнтар, сельгасмашыны і ...ортныя сродкі павінны быць ...втаваны не пазьней 1 сака-...932 г.

...сamольскія ячэйкі павінны ...ка правесьці вучот трактароў ...машын і інвэнтара які патра-...монту. Неадкладна скласьці ...ры з рамонтнымі пунктамі і ...рнямі і прыняць усе захады, ...араз-жа распачаць рамонт. ...сьці вучот комсамольцаў сьле ... кавалёў і, дагаварыўшыся ...яцех з райколгассаюзамі і ... разьмясьціць іх на рамонт-...пунктах і майстэрнях. З пер-...ка дзён працы скласьці ўдар-...амонтныя комсамольска-мала-...ыя брыгады, дабіўшыся каб ... брыгады паказалі сапраўдныя ... бальшавіцкай працы.

...чаткова дабіць ураўнілаўку, ...бязьлічку, перавёўшы ўсе рамонт-...пункты і майстэрні на гасраз-...ахунак, увесьці прогрэсыўна-пра-...ную зьдзельшчыну.

...іцца, каб кожны трактарысты ...нічаў у рамонце прымацава-...а яго трактара, каб кожны ...пушчаны з рамонту трактар і ...сьмашына правяраліся спэ-...ыяльнай камісіяй з абавязковай ...тнасьцю прадстаўніка райза і ...у,—гэта дасьць магчымасьць ...іцца ад паўтарэньня гідкіх ...аў „очковтирания", калі, ... сапраўднага рамонту, машы ...лькі перафарбоўвалі.

...самольскія організацыі Саў-...олгасцэнтру і транспорту па-... ўстанавіць строгі кантроль за ...аячасовым прасоўваньнем за-...ах частак і патрэбнага для ...нту матар'ялу.

...нак, гэта не вырашае спра-...ы поўнасьцю. Комсамольскія орга-...ізацыі на месцох павінны зрабіць ус... магчымае для выкарыстоўвань-...ня ...утраных рэсурсаў. Першым ме...рыемствам у гэтай галіне па-...він... быць збор мэталялому.

...лькі свячасовы і якасны ра-...мон... трактарнага і машыннага пар-...ку, ...ашучая барацьба з опортуніс-...ты...ай недаацэнкай рамонтнай кам...па... забясьпечыць выкананьне пас...та...ы Савету Працы і Абароны.

*Па віне выпускаючага Шапіро І. ...учо... была зьмешчана толькі па ова ...пе...авой. Сёньня перадавая зьмяшча...е... поўнасьцю.

Справа соцыялістычнай БУДОЎЛІ ПАТРАБУЕ неадкладнага выкананьня хлебазагатовак

Плян хлебаздачы саўгасамі выканан толькі на 62,4 проц.

ЛІКВІДАВАЦЬ ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ

Паводле даных Наркомснабу, на 10 сьнежня плян збожжазагатовак выканан толькі на 66,3 проц. Такім чынам, дырэктывы пленуму ЦК КП(б)Б аб форсаваньні тэмпаў загатовак выконваюцца нездавальняюча. Больш таго,—саўгасы, замест таго, каб заняць перадавыя позыцыі, адстаюць у выкананьні плянаў і маюць усяго толькі 62, 4 проц. К гэтаму часу (10 сьнежня) саўгасны сэктар павінен быў поўнасьцю выканаць плян хлебаздачы.

У чым прычына адставаньня? У тым, што поўнасьцю ня ўлічаны політычныя ўрокі Саюзцукру і Саўгастрэсту БССР, не ліквідаваны канчаткова буржуазна-спажывецкія, месьніцкія настроі, слаба праводзіцца масава-політычная праца сярод рабочых саўгасаў.

Чарапашыя тэмпы ў выкананьні загатовак далі саўгасы сыстэмы Малакопрамтрэсту (49,7 проц.), Сьвінаводтрэсту (60,4 проц.). Пры абсьледваньні ЦКБ НК РСІ 130 саўгасаў выяўлены самыя агідныя факты хаваньня збожжа ад дзяржавы, схаваньня раздутых хлебафуражных фондаў, разбазарваньня і безгаспадарчасьці. Прывядзем толькі некаторыя факты.

Саўгас „Каменка" трэсту Сьвінавод. Саўгас ашукаў дзяржаву, паказаўшы 340 чал. рабочых, замест сапраўднага ліку 117. Раздуты кармовы баланс: запас на збожжафураж павялічана на 1876 цэнтн. броніраваны насенны фонд на 131 проц.

Саўгас „Дактаровічы" Насентрэсту, павялічыў патрэбы ў фуражы на 1200 цэнтн. Раздана звыш пайка рабочым 400 пуд. пшаніцы і забраніявана на будучы час, нібы для раздачы, яшчэ 300 пуд.

У саўгасе „Бярэзіна" Саўгастрэсту фактычна ўбрана жыта 32 га, а паказана 27 га. У балянсе не фігураваў гарох. Праверачнай камісіі заявілі, што увесь гарох загінуў. Пры праверцы выявілася, што 30 вазоў гароху схавана. Патрэбнасьць рабочых паводле балянсу павялічана на 2994 цэнтн.

У саўгасе „Зарэчча" трэсту Сьвінавод колькасьць сьвіней перавялічана на 900 штук, балянс кармовых і харчовых культур перавялічаны на 7290 цэнтн.

Комсамол саўгасаў улічыўшы ўсе політычныя вурокі былога кіраўніцтва Саўгастрэсту, абавязаны быў павесьці шырокую работу, каб выканаць плян хлебаздачы, даць рашучы адпор буржуазным тэндэнцыям супроцьстаўленьня свайго прадпрыемства пролетарскай дзяржаве. Рад комсамольскіх, саўгасных ячэек аказаўся ў тыле буржуазных тэндэнцый, ня вырашучай барацьбы за выкананьне плянаў у тэрмін. Раённыя камітэты комсамолу не наладзілі аперацыйнага кіраўніцтва саўгаснымі ячэйкамі, не забясьпечылі іх актыўны ўдзел у збожжазагатоўках.

Заваяваныя ў апошнюю пяцідзёнку тэмпы (амаль 100 проц. выкананьня плянаў Насентрэстам) моцна б'юць па опортуністых, якія супраціўляюцца ў выкананьні плянаў збожжазагатовак. Саўгасы абавязаны ў бліжэйшыя дні выйсьці на перадавыя позыцыі хлебаздачы. Комсамольскія ячэйкі саўгасаў павінны сваім актыўным удзелам забясьпечыць выкананьне плянаў загатовак, належную арганізацыю малацьбы, транспортоўкі. У бязьлітаснай барацьбе з кулацкай агентурай, ва ўмелай организацыі працы павінна быць выяўлена клясавая баяздольнасьць кожнай саўгаснай ячэйкі.

П-ч З.

Так змагаюцца за хлеб

Колгасьнікі колгасу „Кастрычнікавая рэволюцыя", Ратамскага сельсавету (Менскі раён) на сваім сходзе пастанавілі выканаць да 10 сьнежня ўсе віды загатовак. Колгасьнікі сваё абяцаньне зьдзейсьнілі. Аб'явіўшы штурм і вылучыўшы ўдарнікаў,—к вызначанаму тэрміну дабіліся перамог. Збожжа здадзена 100 проц. пляну, бульбы—106 проц., ільнасемя—100 проц., ільнавалакна—100 проц., канапель таксама 100 проц. Мяса (заданьня ня было) колгасьнікі здалі 275 клг.

Колгас „Кастрычнікавая рэволюцыя" падае ўзоры бальшавіцкай барацьбы за хлеб, з яго павінны браць прыклад астатнія колгасы.

Грызун

Пералом ёсьць, штурмаваць да канца

У выкананьні загатовак збожжа і бульбы Грэскі сельсавет (Слуцкага раёну) дасягнуў пералому. На 30 лістапада загатоўлена збожжа 76,1 проц., 78,7 проц. пляну. На колгасах: збожжа 100,6 проц., бульбы 91,2 проц. Аднаасобны сэктар загатовіў збожжа 74,4 проц. Кулацка-заможная частка, дзякуючы патрэбнаму націску зделала больш 80 проц. цьвёрдага заданьня. Дапамог у гэтым декадны штурм прарыву, які праводзіўся на Случчыне з 20 па 30 лістапада.

Аднак кулацкі саботаж не ва ўсіх насельных пунктах злоўлены. Бывае, што кулакі хаваюць збожжа нават у членаў сельсавету. Так, напрыклад, кулак Бычок, каб ня здаць дзяржаве, схаваў 30 пудоў збожжа ў падкулачніка—члена сельсавету Храмцэвіча Сьцяпана.

Грэскі сельсавет, партыйныя і комсамольскія ячэйкі абавязаны замацаваць дасягнуты пералом, яшчэ мацней націснуць на кулацка-заможную частку, выканаць у намечаны тэрмін 100 проц. пляну загатовак.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены" Бранавец.

Разьмеркаваньне ўраджаю скончыць к 1 студзеня

Кожная комсамольская ячэйка—актыўны змагар за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў

„Пры чым тут працадні?—мы ўсе аднолькава працавалі"

Разьмеркаваньня ўраджаю рад колгасаў Полаччыны да гэтага часу не закончыў. Горш таго—некаторыя колгасы груба парушылі пастанову партыі і Колгасцэнтру аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю ў колгасах. Так, напрыклад, у колгасе „Чырвоны баец", Юравіцкага с-савету, старшыня рэвізійнай камісіі—Жыхараў, бяз удзелу праўленьня колгасу, разьмеркаваў усю бульбу не па працаднёх, а па едаках.

—„Пры чым тут працадні?—мы-ж усе аднолькава працавалі",—так тлумачыў колгасьнікам свой учынак старшыня. У выніку кулацкай ураўнілаўкі ў колгасе пала працдысцыпліна: зусім зьнізіўся выхад колгасьнікаў на працу. С-савет і партыйна-комсамольскія ячэйкі на вылазку кулацкага агента Жыхарава не рэагуюць.

У колгасе „Акцябр", Булаўскага с-савету, нават і не пачыналі разьмеркаваньня ўраджаю. У колгасе „Пролетары", Арлеўскага с-с, разьмеркаваньне кармоў праведзена бяз уліку працадзён: ударнікі і лодыры ўсе атрымоўвалі пароўну. У колгасе Карла Маркса, Домнікаўскага с-с, на кожную колгасную гаспадарку выдана па 30 пуд. бульбы, пры гэтым ня ўлічаны ні працадні, ні якасьць працы. Такія-ж зьявы маюць месца ў колгасах: „Комінтэрн"—Васілеўскага с-с, „Чырвоная Горка"—Булаўскага с-с, „Адказ інтэрвэнтам"—Домнікаўскага с-с і інш.

Райколгасаюз толькі ў апошні час узяўся за разьмеркаваньне ўраджаю. Побач з гэтым ёсьць выпадкі, калі організатары працы з райколгасаюзу адмаўляюцца дапамагчы колгасам у разьмеркаваньні ўраджаю. Напрыклад, агроном Каваленка, які працуе па організацыі працы, на запытаньне, чаму ён нічога ня робіць па разьмеркаваньню ўраджаю, адказаў: „Я не політык, а спэцыялісты. Політыкай хай займаюцца тыя, хто мае заданьне на гэта".

Партыйныя і комсамольскія організацыі пералічаных вышэй колгасаў таксама не ўдзяляюць патрэбнай увагі пытаньням разьмеркаваньня ўраджаю ў колгасах, забываючыся на тое, што правільнае разьмеркаваньне ўраджаю—адна з умоў організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў.

Трэба нарэшце пакласьці канец опортуністычнай недаацэнцы разьмеркаваньня ўраджаю. Партыйна-комсамольскія організацыі зараз-жа павінны мобілізавацца на ўдарнае заканчэньне разьмеркаваньня ўраджаю ў колгасах, згодна ўстаноўленых партыяй і Колгасцэнтрам прынцыпаў: „хто больш і лепш працуе, той больш і атрымоўвае".

Мікола Віленскі.

Гнаць кулацкіх агентаў з комсамолу

Ячэйка КСМ пры колгасе „Прабуджэньне" (Сьцескі с.-с, Парыцкага раёну) існуе больш году. Але ніякай працы ячэйкі не адчуваецца. Барацьба за ўмацаваньне колгасаў, за палепшаньне гаспадаркі ня сталі стрыжнем яе работы. У колгасе было 39 сьвіней. Замест організаваць сьвінуую фэрму, гэтых сьвіней раздалі па аднэй кожнаму колгасьніку. Ячэйка не рэагавала на кулацкую дзялёжку абагуленага стада.

У Ламавіцкім сельсавеце сэкратар ячэйкі колгасу „Курын", замест дабіцца поўнай і свячасовай здачы ільнавалакна дзяржаве, перш за ўсё разьмеркаваў 80 проц. таварнага лёну паміж колгасьнікамі. Сам сэкратар ячэйкі, зьяўляючыся адзіночкай бярэ сабе 17 клг. ільнавалакна.

У ячэйцы КСМ пры колгасе „Калініна" комсамолец Балаўскі, зьяўляючыся жывёлаводам і загадчыкам гаспадаркі, зусім ня цікавіцца даручанай яму справай. Цялячая фэрма дагэтуль не ўкомплектавана. Хлявы не абсталёўваюцца.

У колгасе поўная безгаспадарчасьць зброя і інвэнтар параскіданы і расьцягваюцца.

Кулакі і былыя дваране пралезьлі ў колгас і разбураюць яго, але на гэта ячэйка не зьвяртае ніякай увагі. Комсамолец Бадоўскі нават выступае на сходзе ў абарону гэтых варожых элемэнтаў.

У ячэйцы „Шацілка" 12 комсамольцаў. Замест праводзіць гаспадарча-політычныя кампаніі яны займаюцца гульнёю ў карты, п'янкай і танцульнямі. Сам сэкратар ячэйкі Сухавіцкі стаў на чале п'янак і дэбошаў. Гэты сэкратар—тыповы опортуністы—заяўляе: „Сярод польскай моладзі комсамольская ячэйка ніякага ўплыву ня можа мець і таму работы ў яе асяродку ня трэба праводзіць".

Вось галярэя опортуністых, бязьдзейнікаў і агентаў клясавага ворага, якія па непаразуменьню знаходзяцца яшчэ ў радох Парыцкага комсамолу.

Райком ЛКСМБ павінен безадкладна зацікавіцца работай адзначаных ячэек і ачысьціцца ад варожага комсамолу элемэнту. Райком павінен забясьпечыць, каб гэтыя ячэйкі сталі сапраўднымі барацьбітамі за гаспадарча-організацыйнае ўмацаваньне колгасаў, за правядзеньне ўсіх політычных кампаній.

Вока.

Ячэйка павінна перабудаваць работу па-новаму

Пры колгасе „Комсамолец", Любаньскага раёну,—адным з буйнейшых у раёне—існуе комсамольская ячэйка. Ячэйка ня цікавіцца пытаньнем гаспадарчага ўмацаваньня колгасу. Замест падаць прыклад, комсамольцы працуюць горш астатніх колгасьнікаў. Вось факты. Комсамолка Шаргун Палагея выпрацавала толькі 71 працадзень, Майсеня Міхась—85, Рашчэня Матруна—69. Колгасьнікі не комсамольцы ідуць уперадзе, як напрыклад: Рашчэня Апанас выпрацаваў 234 працадні, Шаргун Суклюта—150 і г. д.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва комсамольскую ячэйку зусім ня цікавіла. Ніякай культмасавай работы не праводзіцца.

Ю.

За бальшавіцкае вывучэньне гісторыі партыі

(З прамовы т. Кагановіча на сходзе, прыьвечаным Х-годзьдзю Інстытуту Чырвонай Профэсуры, ад 1 сьнежня)

(Канец. Пачатак гл. ва ўчарашнім № „43")

Выключаны з партыі трацкісты, які атрымаў трыбуну на комфракцыі, выступае ў абарону люксэмбургіянства і заяўляе: Люксэмбургіянства зьлілося з бальшавізмам"- А яшчэ раней, у 1927 г., ён пісаў, што ў 1918 г. „люксэмбургіянства ператварылася ў бальшавізм". Альтэр падхапляе сьцяг люксэмбургіянства. Яно яму, трацкісту, зараз патрэбна, каб прыкрыцца ім, як маскай.

І ў кожнага бальшавіка адразу павінна ўзьнікнуць пытаньне—у чым справа? А справа ў тым, таварышы—і ў гэтым новае сёньняшняга дня,—што трацкістыя, сапраўдныя трацкістыя, сарамлівыя, бялеючыя, чырванеючыя, чарнеючыя ў простым і пераносным сенсе гэтага слова трацкісты ня могуць зараз выступаць пад апаганеным контр-рэволюцыйным сьцягам Троцкага, які падхоплен цяпер самымі злейшымі ворагамі пролетарскай дыктатуры. А таму адкрытыя і скрытыя трацкістыя падхапляюць новы сьцяг, сьцяг люксэмбургіянства, сьцяг Розы Люксэмбург, замучанай нямецкімі соцыял-дэмократамі, каб злоўжываць ім у сваіх трацкісцкіх мэтах.

Для чаго? Для каго, каб пад гэтым сьцягам папрабаваць па-новаму паставіць пытаньні з трацкісцкай пляцформы, папрабаваць занава рэвізаваць асновы марксызму-ленінізму. У новых умовах паставіць па-новаму старыя трацкісцкія пытаньні аб бальшавізьме, аб пераўзброеньні, аб фракцыйнасьці і г. д. Сутыкаемся з такімі фактамі, калі людзі, якія стараюцца парваць з трацкісцкім мінулым, ня вызваліліся на справе ад мінулага грузу. На фракцыі гісторыка-марксыстых выступаў тав Радэк. Паводле яго прамовы выходзіць, што Комінтэрн прыняў у свае рады тое, што было лепшага ў рабочым руху і што ў Комінтэрне нельга забываць усіх плыняў і раўчачкоў, якія ўліліся ў бальшавіцкую партыю. Тав. Радэк павінен быў-бы ведаць, што прадстаўляе з сябе тэорыя „раўчачкоў". Гэта-ж па сутнасьці ідэя жнівеньскага блёку. Там таксама хацелі мець розныя раўчачкі, каб іх потым аб'яднаць у адну раку, але нічога з гэтага ня вышла, як вядома, раўчачкі выліліся ў розныя бакі. Трацкізм аказаўся дрэннай па судзінай дзіравай. Хаця ў нас зараз ірыгацыя пастаўлена вельмі высока, але ўсё-ж такі ў галіне політыкі такая ірыгацыя непрыстасоўна. Тут тэорыя рудняў, мэханічнае злучэньне розных рудняў ня выйдзе. Так у бальшавіцкую партыю прышлі асобныя лева-соцыял-дэмократычныя элемэнты—гэта правільна. Але яны прышлі пасьля таго, як бальшавізм разьбіў іх забабоны, разьбіў іх няправільныя ўстаноўкі. А тав. Радэк, гаворачы аб Комінтэрне, забыў 21 умову. А ці-ж 21 умова ня была праведзена, ці-ж гэта ня была зброя барацьбы з усімі элемэнтамі, якія прабавалі яшчэ захаваць свае паасобныя раўчачкі і позыцыі? Ці можна тут гаварыць аб злучэньні раўчакоў? Ясна, што нельга. Тав. Радэк павінен зразумець, што тэорыя раўчакоў падводзіць базу пад свабоду груповак, пад свабоду фракцыйнасьці. Калі ўлічыць „раўчачок", трэба-ж яму даць магчымасьць мець сваю „плыньку". Не, таварышы, наша партыя—гэта ня збор мутных раўчачкоў, а гэта такі магутны і монолітны паток, якога ня могуць спыніць ніякія раўчачкі, бо ён мае ўсе магчымасьці для таго, каб разьбіць усе перашкоды на сваім шляху (бурныя аплёдысмэнты).

Наша партыя згуртавана, як ніколі, вакол свайго ленінскага ЦК, яна адзіна ў барацьбе за ўзмацненьне пролетарскай дыктатуры, за ўмацаваньне завяяваньнаў соцыялістычнай рэволюцыі. І калі ЦК нашай партыі карыстаецца выключным аўторытэтам сярод рабочых і колгасных мас, калі наш кіраўнік, правадыр нашай партыі тав. Сталін (бурныя аплёдысмэнты) карыстаецца непадзельным падтрыманьнем і любоўю партыі, комсамолу пераважнай большасьці рабочай клясы, колгасьнікаў, дык гэтым мы абавязаны таму, што наш ЦК бальшавікоў бязупынна, крок за крокам, бязьлітасна ва ўсіх галінах выкрываў усякія спробы скажэньняў генэральнай лініі нашай партыі, ператварэньня яе ў „раўчакі" і „раўчачкі", усялякія спробы адхіленьня ад асноўнага шляху нашага напрамку—вось посьпех перамогі соцыялізму ў нашай краіне і ва ўсім сьвеце.

Таварышы, труднасьцяй у нас, у нашым будаўніцтве шмат, барацьба яшчэ ня скончана. Клясавая барацьба ў краіне працягваецца, яна ёсьць у розных кутках вёскі і гораду. Спробы буржуазных і дробна-буржуазных уплываў ёсьць ня толькі ў рабочай клясе праз кулакоў, і падкулачнікаў, якія пралазяць у яе рады, але яны ёсьць яшчэ і ў нашай партыі.

У дзень Х-цігадовага юбілею ІЧП кожны ІЧП'ист павінен сабе сказаць; я быў байцом за лінію партыі, я буду яшчэ больш моцным і стойкім байцом я яшчэ больш сальлюся з партыяй, згуртую другіх і ўпарта, настойліва буду працаваць над марксыцка-ленінскім выхаваньнем моладзі, над згуртаваньнем мільёнаў вакол ленінскага ЦК (бурныя воплескі).

Саўгасвучы яшчэ на правох бяспрытульн[ых]

Не дапусьціць зрыву падрыхтоўкі кадраў для саўгасаў. Комсамол павін[ен] забясьпечыць школам нормальную вучобу

„Чырвоная Зьмена" ня раз на сваіх старонках сыгналізавала аб ганебных адносінах раду цэнтральных і раённых організацый да новаарганізаваных школ саўгасвучу. Гэтыя сыгналы не пачуты. Саўгасвучы, задача якіх каваць кваліфікаваныя кадры саўгасам, яшчэ дагэтуль у стане беспрытульных.

Сёньня зноў даем матар'ялы аб Менскім і Бярэзінскім саўгасвучах, дзе бяздушныя, наплявацельскія адносіны гаспадарчых і комсамольскіх організацый зрываюць вучобу.

Такое становішча нецярпіма.

Мы патрабуем ад райкомаў КСМ, тых раёнаў, дзе знаходзяцца саўгасвучы, устанавіць суровы контроль і забясьпечыць нормальны ход заняткаў.

РСІ не павінна дапусьціць зрыву падрыхтоўкі кадраў для саўгасаў, а прыцягваць да адказнасьці ўсіх, хто ўздумае сарваць гэтую справу.

Даць нормальныя ўмовы саўгасвучу

Пры Бярэзінскім жывёлагадоўчым саўгасе сёлета організавана школа для падрыхтоўкі кваліфікаваных саўгасных кадраў. Хутка, аднак, раённая організацыя і кіраўніцтва саўгасе зусім забыліся пра яе.

Падрыхтоўкі да прыёму вучняў не праведзена. Не падрыхтавана ні інтэрнату, ні сталоўкі. 30 проц. вучняў адразу-ж адсеялася.

Організаваная за апошні час сталоўка вельмі дрэнна працуе. Стравы гатуюцца вельмі ніжкай якасьці. Для школы адшукалі інтэрнат, але пра абсталяваньне яго ніхто ня думае.

Райспажывсаюз ня ўключыў саўгасвучу ў пляновае забясьпечаньне. Сталоўка ня мае продуктаў, вучні—прамтавараў.

Падручнікаў для вучобы няма. Сшыткі прывезьлі, але адміністрацыя школы чамусьці не раздае іх вучням.

Загадчык школы саўгасвучу, т. Семянкоў, ніякіх мер для наладжваньня вучобы і палепшаньня быту вучняў ня прымае.

Не цікавіцца становішчам саўгасвучу і Бярэзінскі райком КСМ. У школе засталося зараз толькі 50 вучняў, замест 80 чал. па пляну.

Мы просім РКК РСІ ўмяшацца ў гэтую справу і не дазволіць сарваць нормальную вучобу ў саўгасвучы. Бярэзінская школа саўгасвучу патрабуе даць ёй нормальныя ўмовы для вучобы.

Комсамолец Ш.

Да суровай адказнас[ьці]

Менскі саўгасвуч налічвае 111 вучняў. Вучоба налад[жана] дрэнна. Да гэтага часу ня[ма] ўсіх патрэбных настаўнікаў. [...] ужо настаўнікі ёсьць, але працу[юць] яны бясплянава. Вучні ня [...] памяшканьня для заняткаў, і [...] займацца ў інтэрна[це] [на] сваіх ложках.

Грамадзкае харчаваньне [...]лена дрэнна. Сталоўка ад інтэр[нату] за поўтара кілёметры. У ст[...] і інтэрнаце санітарныя [...] надзвычай дрэнныя. Вучні ня[...] хадзілі ў Белкоопсаюз з [...] палепшыць умовы, [...] атрымоўвалі адказ: „Выйдзіце [...], мы з блатнымі ня [...] гаварыць".

Аб бясчынных адносінах Белк[оопсаюзу] [...] саюзу да саўгасвучу вучні [...] да ведама РСІ, РВК і [...] пракуратуры, там ім абяцалі [...] магчы, але толькі абяцалі. У [...] ы 14 вучняў пакінулі саўгас[вуч] а многія падумваюць у бліжэ[йшы] час „даць драла".

Брыгада „Ч. З[...]

4-ты дзень лясной эстафэты

Полацак у першых радох лясной эстафэты

На прыкладу Полацкай КСМ организацыі, раённыя камітэты і комсамольскія ячэйкі павінны ўклю[чыцца] ва ўсесаюзную лясную эстафэту, па-бальшавіцку змагацца за лес

Акомсамолім леса-нарыхтоўкі

Комсамолія Полаччыны ўключылася ў месячнік лясной эстафэты. Уся ўвага комсамольскай організацыі зьвернута на поўнае выкананьне пляну дрэвалесанарыхтовак і вывазкі. Па ініцыятыве РК створан пры леспрамгасе штаб для правядзеньня лясной эстафэты. Вызначаны наступныя маршруты: вярбоўка рабочай і гужавой сілы, забясьпечаньне продуктамі і прамтаварамі і культбытавое абслугоўваньне лясных рабочых.

Прыняты захады да акомсамольваньня леспрамгасаў. На рашаючыя вучасткі лесараспрацовак мобілізавана 35 комсамольцаў. Створаны 3 паказаальныя комсамольска-маладзёжныя брыгады. На масцох, дзе працуюць мобілізаваныя комсамольцы, організаваны комячэйкі.

Комсамольскія брыгады ўжо [...] цэлы рад ўзорных прыкладаў [...]цы. Брыгада т. Мядзьведзева [...] выканала норму выпрацоўкі [на] 30 проц.

Асаблівая ўвага зьвернута [на] вярбоўку рабочай і цягавай сі[лы]. Праводзіцца організаваны на[бор] возчыкаў і рабочых праз заклю[чэнь]не дагавароў з колгасамі і [...] асобным сэктарам. У дапамогу [ляс]ковым комсамольскім ячэйкам [...]раваны брыгады гарадзкога [...]ву з 15 асоб.

Лясную эстафэту комсамолія [По]лаччыны праводзе пад знакам [ар]ганізацыі суботнікаў і чырво[ных] абозаў і адгрузкі дроў пролетарск[ім] цэнтрам. Комсамолія Полаччы[ны] пакажа добрыя прыклады ў бар[аць]бе за лес.

Т. Сакалінскі

16-га сьнежня, а 8 гадз. увеч., у памяшканьні рэдакцыі „Чырвонай Зьмены"

АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА

рабочай рэдколегіі старонкі фабзавучніка

На нараду павінны зьявіцца: т. т. Рэцкая—ФЗВ „КІМ", Гарбачэнка—ФЗВ „Ударнік", Барысэвіч—МШВ, Рухавец—Сувязь, Быкаў—друкарня імя Сталіна, а таксама прадстаўнікі ФЗВ „Комунаркі", будвучу Белдзяржбуду і таварышы, якія жадаюць працаваць у старонцы фабзавучніка.

Просьба да організацый вызваліць гэтых т. т. ад грамадзкай працы ў гэты дзень

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены"

С Голуб

Першая перамога

(Урывак з апавяданьня)

Адыйшло, адбуяніла палкае лета. Надыйшла восень. Агалелі палі, сена жаці. Час ад часу чуваць разьвітальныя крыкі жураво́ў у паветры. Глуха шуміць лес і ня чуваць у ім музыкі-песень розных птушак.

Восень пісала законы.

Час малацьбы ў самым разгары.

Ажыло гумно колгасьнікаў. Зышліся хто з граблямі, хто зьвілкамі. Зялезны гімн сьпявае трактар. Яму ў такт грыміць малатарня. Плыве з зубастага роту малатарні шырокай і мягкай пасьцельлю салома, а з другога боку—паток залатых зярнят. Толькі спраўляйся завязваць ды падстаўляць парожнія мяшкі.

Кожны стараецца, кожнаму ахвота, каб як скарэй апаражніць гумно. Сёньня дамалоткі. Сёньня даведаюцца аб выніках спаборніцтва. Пракоп—машыніст, ён-жа брыгадзір. Яго брыгада спаборнічае з Рыгоравай. Малоцяць даўно. Учора першае месца было за ім, а сёньня? Сёньня яшчэ не вядома. Яго трэба адваяваць упартаю працай. І ня буйны пот, ні стомленасьць, ні хмары пылу ня спыняць ніводнага. „Перагнаць"—думаюць адны. „Дагнаць і перагнаць—думаюць" другія. „Перагнаць, перагнаць"—чуецца кожнаму ў сьпевах трактара і малатарні.

—Хлопцы націсьнем"—жартуе Пракоп, калі ўбачыць, што стомленыя зьнізілі тэмпы. І сапраўды, трэба надзвычайна борзда насіць салому і падаваць снапы, калі падае ў цапкі Пракоп. Моцны ён працаўнік. Няма тае работы, якая-б не гарэла ў яго руках. І любяць і паважаюць яго за гэта колгасьнікі. Яны ўжо забыліся пра яго памылкі. Ён зусім другім чалавекам зрабіўся пасьля выяўленьня шкоднікаў. Але за тое і вытрымаць ня можа калі хто нарочна залянуецца.

—Брыдка глядзець!—Крычыць ён на гультая.

—Во як павінен работаць!—і ўзяўшы вілкі або граблі зараз-жа пакажа.—Іначай такім у маёй брыгадзе ня месца.

І кожны хто хацеў у яго брыгадзе застацца, слухаў яго і стараўся працаваць па-ўдарнаму.

—Шабаш мальцы, падмацуемся крыху!—уткнуўшы вязаны сноп у цапкі крычаў Пракоп, калі прывозілі на гумно абед. Адны данашвалі, другія падграбалі, трэція абабіваліся ад пылу.

Праз некалькі хвілін, хто седзячы, хто лежачы, хто стоячы малацілі лыжкамі кожны над сваёй міскай гарачай стравы.

—А ў мінулым годзе—абцёршы рукавом вусы пасьля падсілкаваньня казаў Пракоп,—працавалі ўсе, а накормлены быў ня кожны. Калатніны, лаянкі больш было чым працы.

— Вядома, які быў кіраўнік, такая была і праца—заўважыў Архіп.—А мінулае разьмяркаваньне працы вечна вось тут у мяне будзе сядзець,—пастукоў у свае грудзі бела барады дзед Амелька. Бачыў. як кралі Стрыгуны хлеб, ня вытрымаў і сказаў ім у вочы, дык паціскалі разы тры за гэта. Страшылі забіць, а жыць хацелася дык маўчаў. Маўчаў—праказаў другі раз, пяжка ўздыхнуўшы.

—Гняла і губіла нас політычная сьляпата наша.

—Ніхто і ня думаў нават, што калі небудзь з імі можна будзе разьвітацца.

Так пясцкала гутарка аб мінулым жыцьці. А потым бурлілі разважаньні аб пабудове вялізарных сьвінарнікаў і сырабойні.

—Час пачынаць, мальцы,—пакарміўшы кожны клапан машыны, паклікаў Пракоп.

Праз некалькі хвілін кіпела, буяніла праца.

А вечарам, калі патанула за лесам сонца, калі сьціхлі машыны. а людзі сьпяшаліся к сталоўцы—тады да Пракопа зьвярнуўся Рыгор,

—Ну, што дзядзька, Пракоп! Хто сёньня справуляе перамогу?

У яго голасе зьвенела задорная нотка радасьці.

—Эх. ты, шкет.. Шкада, што старараты, а то-б з двума такімі яшчэ справіўся—адказаў ён з прыкметным незадавальненьнем. Радасьць Рыгорава яго спалохала. Ён зараз-жа накіраваўся да „дошкі тэмпаў".

—На семсот кілёграм перагнаў мяне!—прастагнаў Пракоп і відна было, як ногі яго закалаціліся. А пазаўчора ў мяне было на многа болей змалочана.

—Дык, што тут дзіўнага—падышоўшы да дошкі, праказала Хася.—Ён толькі ліквідаваў сваю запазычанасьць. Але агулам за ўсе дні вы на дваццаць кілеграм болей змалацілі.

—На дваццаць кілёграм!—прагаварыў ён упаўшым голасам. За дзесяць дзён на дваццаць кілёграм болей. А раней так шырока грымела аб ім слава, як аб надзвычайным работніку. І на табе: „шкет" з ім справіўся. Гэта было першае здарэньне ў яго жыцьці і яно на яго страшна падзейнічала.

—Ну, што з малацьбой разьлічыліся? запытаў Алесь, моцна паціснуўшы Пракопу руку. Яго твар, шапка і плечы былі пакрыты тоўстым пластом пылу. Вочы сьвяціліся радасьцю.

— Змалацілі, адсек Пракоп.

— Малайцы, хлопцы, малайцы!—з шчырай удзячнасьцю праказаў Алесь і яго губы скрывіліся ўсьмешкай. Я спадзяваўся, што скончыце і загадзя дамовіўся аб перавозцы грузавікамі. Заўтра пяць машын і трыццаць падвод павязуць збожжа ў горад. Мы будзем першымі па выкананьню хлебазагатовак у раёне.

— Гэта добра,—павясялеў Пракоп. —А як там справа з апалам?

— І з апалам ня дрэнна.—хутка і ўпэўнена адказаў Алесь.—Па заключанай сёньня ўмове з лясьніцтвам, мы сорак пяць чалавек накіроўваем на лесанарыхтоўку на пяць месяцаў. А яны нам адводзяць дзялянку для дроў Так што і грошай заробім і зімой мерзнуць ня будзем. Ты і там будзеш брыгадзірам, будзеш узноў з Рыгорам спаборнічаць.

— Пакуль жыць змагу—датуль і спаборнічаць буду.

— Гэта трапна сказана,—заўважыла Хася, аддаючы Пракопу яго працоўную кніжку.—Ня дзіва, што у вас кожны месяц па сорак восем пра[цо]дзён выходзіць.

— Спрытны ён чалавек,— ду[маў] Пракоп пра Алеся, ідучы да дому. Усё ў яго ідзе, як па масьле.

Ціхі і цёплы вечар. Неба іскры[лася] зоркамі. Усё болей і болей гус[цеў] змрок. Здавалася ўсё, што жыло і рушылася ў колгасе, глыбока, на[доў]га заснула.

— А табе ўжо дня не хапае працы—накінулася на Пракопа жо[нка], калі ён зьвярнуўся да хаты.

— Трэба-ж было пагутарыць з [ча]лавекам,—быў ня злосны адказ П[ра]копа.

— А сын чакаў, чакаў цябе і [не] дачакаўся. Атрымаў боцікі, дык [хацеў] хваліцца небарака. І заснуў з імі.

— А я еду на лесанарыхтоўкі—[ска]заў Пракоп, ужо лежачы ў пасьц[елі].

У хаце зрабілася ціха і цёмна.

А на другі дзень, калі яшчэ ў[се] спалі, доўгі абоз рушыўся з хлеб[ам] у горад, рушыўся па гладкай тор[най] дарозе.

16 сьнежня 1931 г., роўна а 6-й гадз. увеч.,

у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі

(Комсамольская, 25)

АДБУДЗЕЦЦА АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД

актыву Менскай організацыі ЛКСМБ

ПАРАДАК ДНЮ:

1. ВЫНІКІ ПЛЕНУМУ ЦК УсеЛКСМ.

Сваячасовая яўка сэкратароў і сяброў бюро камітэтаў, колектываў і ячэек—абавязкова.

Білеты на актыў атрымаць у ГК.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ ЯНКОВІЧ

ДА ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б

Конкрэтнымі перамогамі рапартуем партыі

...нскі комсамол вырас, загартаваўся ў барацьбе за гэнэральную лінію партыі

...АЛЕПШАНЬНЕ ПАРТКІРАЎНІЦТВА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЗЬМЕНЕ ПАРТЫІ—КОМСАМОЛІ НОВЫЯ БАЛЬШАВІЦКІЯ ПЕРАМОГІ

...ьня пленум Менскага Гаркому КП(б)Б. Сёньня Менская комса...обіць на пленуме справаздачу аб сваёй рабоце, дэманструе ...ядольнасьць у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.

...ая комсамолія, якая зьяўляецца бўйнейшым атрадам ленінскага ...лу Беларусі, дамаглася вялізарных посьпехаў у ажыцьця...пастанову апошніх комсамольскіх зьездаў, у рэалізацыі 6-ці ...в. Сталіна.

...ія посьпехі, гэтыя перамогі заваяваны дзякуючы таму, што ...льская організацыя пільна стаіць на варце чыстаты генэраль...іі партыі, дзякуючы таму, што партыйная організацыя значна ...ла кіраўніцтва комсамоліяй Менску.

...нум гаркому КП(б)Б скажа свае бальшавіцкае слова аб стане ...і комсамолії, аб яе барацьбе за генэральную лінію партыі, аб ...і тых прарываў і недахопаў, якія маюцца ў яе практычнай

...шаючым стымулам для далейшай работы і барацьбы комсамо...ску, рашаючай умовай для заваёў новых перамог зьявіцца да...няўхільнае паляпшэньне партыйнага кіраўніцтва ўсімі зьвень...комсамольскай організацыі.

Конкрэтныя паказчыкі нашай барацьбы

Трэці рашаючы год праходзіць у нашай організацыі пад знакам мобілізацыі мас комсамольцаў і бес партыйнай рабочай моладзі на барацьбу з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, пад знакам мобілізацыі на вырашэньне тых павышаных задач, якіх паставіў IX-ты і X-ы зьезды КСМ.

З 8210 чал. комсамольцаў у вытворчай частцы організацыі 7565 ударнікаў, што складае 72,1 проц.

Плянаваньне стала асноўнай формай барацьбы комсамолу за высокія тэмпы. Асноўнай формай уцягваньня комсамольцаў і б-п моладзі ў плянаваньне на вытворчасьці, у высоўваньні сустрэчных плянаў, у цэху зьяўляецца плянава-опэрацыйная група.

Усяго на прадпрыемствах гораду —106 плянава-опэрацыйных груп, дзе ўдзельнічае 912 комсамольцаў.

Плянава-опэрацыйныя групы зав. Варашылава праявілі асаблівую ініцыятыву барацьбы з непаладкамі ў міжцэхавым плянаваньні.

Плянава - опэрацыйныя групы заводу „Комунар“ выявілі шмат дэталей, якія ляжалі на складах і якія неабходны былі ў цэху; праявілі шмат энэргіі ў паляпшэньні якасьці продукцыі, у высоўваньні сустрэчных плянаў.

Неабходна адзначыць, што пастанова ВСНГБ і УсеЦСПС аб працы плянава-опэрацыйных груп, аб вылучэньні спэцыяльных вытворча-плянавых працаўнікоў на кожным прадпрыемстве, на большасьці прадпрыемстваў ігноруецца, на шэрагу прадпрыемстваў аказваецца зусім недастатковая тэх. дапамога а часам зусім няма тэх. дапамогі ў працы плянава - опэрацыйных груп (Тэкстыльная, „Полымя рэв“, Цяга, Хлебазавод).

Вопыты лепшых прадпрыемстваў па організацыі пастоў, па збору і рэалізацыі рабочых прапаноў, організацыі спэцыяльных вечароў рацыяналізацыі, якія-б далі добрыя вынікі, ня былі перанесены на ўсе к-вы і ячэйкі

Гістарычнае выступленьне тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай, яго словы „тэхніка ў пэрыяд рэконструкцыі вырашае ўсё“ мобілізавалі ўвагу ўсёй КСМ організацыі на асваеньне новай тэхнікай.

Організацыяй сеткі гурткоў, увядзеньнем спэцыяльных гадзін па вывучэньню тэхнікі ў партыйных і комсамольскіх політшколах, організацыяй курсаў, тэхвікумаў і г. д. адказала організацыя на заклік тав. Сталіна. На прадпрыемствах гораду працуе 72 тэх. гурткі, у якіх удзельнічае 2229 чал.

Гарком КСМ заключыў соцдагаворы з спэцыялістамі НДІ прамысловасьці з тым, каб яны дапамагалі організацыі ва аўладаньні тэхнікай, але належных вынікаў яшчэ ня маем.

Шэраг колектываў яшчэ і на сёньняшні дзень не паставілі на належную вышыню тэхнічную вучобу. Шчотачная, Дом Ураду, Шчацінная, Менбуд і Угіль ня маюць нават тэхнічных гурткоў. Тэх. вучоба ў большасьці сваёй не перанесена ў групу, брыгаду, што ў недастатковай ступені мобілізуе ўвагу ўсіх ударнікаў на вывучэньне тэхнолёгічнага процэсу.

Менскі комсамол зараз-жа быў уключан у рэалізацыю 6-ці гістарычных умоў т. Сталіна.

Па комсамольскай арганізацыі быў абвешчан вытворчы конкурс. У гэты конкурс былі ўцягнуты ўсе вытворчыя колектывы і ячэйкі гораду.

Зараз гэты вытворчы конкурс пераключан на сталінскі паход, абвешчаны „Комсомольской Правдой“.

Асаблівую настойлівасьць праявіла Менская організацыя ў рэалізацыі ўмовы Сталіна аб гаспадарчым разрахунку. Усяго пераведзена на гаспадарчы разрахунак 361 брыгада, з іх маладзёжных 118. Усе гэтыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады служаць прыкладам на ўсіх прадпрыемствах у выкананьні прамфінпляну.

Гасп.разрахунковыя маладзёжна-комсамольскія брыгады ідуць перадавымі па ўсіх прадпрыемствах у выкананьні прамфінпляну.

Комсамольская брыгада страгалей зав. „Бальшавік“—прамфінплян выканала на 154 проц, маладзёжныя брыгады зав. Варашылава прамфінплян выконваюць на 130,—100 проц. Абутковая фабрыка маладзёжныя комсамольскія брыгады прамфінплян выконваюць на 120 проц.

Шэраг добрых спраў мае організацыя ў справе барацьбы з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, шэраг колектываў былі ініцыятарамі пераводу асобных станкоў на гаспадарчы разрахунак.

На шэрагу прадпрыемстваў колектывы КСМ былі ініцыятарамі па пашпартызацыі варштатаў.

Організацыя на працягу году правяла вялікую працу ў галіне ажыўленьня энэргэтычных яч. на вытворчасьці.

Гаркомам ЛКСМБ былі мабілізаваны 225 комсамольцаў на торфараспрацоўкі. Праведзена была масавая праца на торфараспрацоўках.

Для азеляненьня гораду і паляпшэньня дарог былі організаваны суботнікі.

Комсамол гораду быў лепшым памочнікам партыі ў ліквідацыі прарываў, якія мы мелі ў выкананьні фінпляну.

У сыстэме коопэрацыі маецца на сёньняшні дзень 13 яч. ЛКСМБ. Усе магазыны МЦРК пераведзены на гаспадарчы разрахунак, зьдзельшчыну. Горш абстаіць справа ў Белгандлі, дзе на сёньняшні дзень маецца ўсяго 2 магазыны пераведзеных на гаспадарчы разрахунак. Торгфінплян па МЦРК выканан на 75 проц.

Хэйман.

Перабудова комсамольскай работы—ключ нашых перамог

...нешні дзень у Менскай ор...і 374 комсамольскіх груп. ...ая армія нізавога комса...га актыву.

...мольскія групы заводу ...вік“ 1-га і 2-га хромцэхаў ...у сваёй штодзённай рабо...ы гэроічнага змаганьня за ...ньне прамфінпляну. Групы ...заводу штодзённа абгавар...ытаньні аб якасьці про...зьменна-сустрэчных плянаў ...ытаньні.

...мольскія групы заводу імя ...лава, імя „Чырвонай Зьме...упы зав. „Камунар“, ф-кі ...х“, друкарні імя Сталіна, ...тчніка“ зьяўляюцца ініцыя...правядзеньня 10-ці хвілін...рад па выкананьню зьмена...ных плянаў.

...з гэтым у перабудове ...комсамолу на вытворчасьці ...эраг недахопаў: перабудова ...льскай работы на вытвор...ня стала набыткам усёй ...цыі ЛКСМБ Менску; да ...часу комсамольскія групы ...я вызначылі зьместу работы ...ым зьвяне; адсутнічае ін...ж. нарады з організатарамі ...льскіх груп.

Напрыклад, „Беларуска“ прыняла за 31 г. — 65 чал., адсеялася — 28 ч., Шчотачная—прыняла 38 ч. адсеялася 14 ч, і г. д. патрэбна адзначыць. што ГК КСМ слаба, не опэрацыйна займаўся пытаньнямі замацаваньня навічкоў.

Усяго ў Менскай організацыі КСМ налічваецца на 1-XII-31 г. 227 гарадзкіх і вясковых колектываў, камітэтаў і ячэек у складзе якіх 14.631 чалавек. Вытворчых колектываў і яч. 57, савецкіх—40 вучэбных —33, колгасных 83, саўгасных — 14.

Партыйнае кіраўніцтва

Парткіраўніцтва за апошні час значна палепшылася, аб чым яскрава сьведчаць посьпехі, дасьцігнутыя ленінскім камсамолам па яго ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Аднак, яшчэ слабая пастаноўка партыйнага кіраўніцтва ў нізавых партыйных ячэйках. У большасьці партыйных ячэек і к-ваў партыйнае кіраўніцтва заключаецца ў прысутнічаньні партпрымацаваных на бюро, сходах. Частка партыйных яч, не накіроўваюць сваё кіраўніцтва на практычную дапамогу ў рабоце.

Асабліва не здавальняючае партыйнае кіраўніцтва вясковай часткі організацыі. Партыйныя ячэйкі на мясцох ня ведаюць колькі маецца комсамольскіх яч. негаворачы аб практычнай і конкрэтнай дапамозе.

Трэба адзначыць, што партыйны асяродак у КСМ нездавальняючы.

...проц. рабочай моладзі ў комсамоле

...ны ахоп раб. моладзі пра...сьці гораду пры наяўнасьці ...оўнага шпаркага павялічэнь...і росту складае 74 проц. ...азы комсамолам.

...яўнасьці значны рост вяско...кі організацыі. За гэты ...анізавана 64 новых колгас...і саўгасных яч. ЛКСМБ.

...наквартальна: 1-шы квар...72 чал. 2-гі квартал—2195 ч. ...артал—4259 чал.

...ыя 2 месяца 4-га кварталу ...89 чал.

...1-месяцаў 1931 г. прынята ...нізацыю 8615 чал.

...й-жа час колектывы будаў...скуранай, хэмічай і іншых ...прамысловасьці слаба займа...ытаньнямі росту.

...амацаваньне росту

...раве ўключэньня навічкоў ...гаспадарча-політычную работу ...мемстваў мы маем цэлы рад ...ньняў.

...прадпрыемствах „Бальшавік“, ...мар“, „Кастрычнік“. Дру...імя Сталіна, завод імя Вара...„Полымя рэволюцыі“ ...комсамольцы навічкі паказ...добрыя прыклады працы, ...ты 100 проц. ахоп навіч...ц. спаборніцтвам і ўдарніц...

...й-жа час цэлы рад комса...х колектываў недаацаніў ...ьці работы з навічкамі, ...ьня іх у конкрэтную ...прамысловасьці, і штодзённай ...гі ім з боку колектываў.

...ку дрэннай пастаноўкі ма...ыхаваўчай работы з навічкамі, ...ку адсутнасьць ўсякага дыфэ...занага падыходу да навічкоў, ...адсеў навічкоў з КСМ.

15-ты дзень месячніку штурму

Усе сілы на вывазку торпу!

У штурмавы месячнік вывазкі торпу ліквідаваць запазычанасьць

Паводле пляну, у 4-м квартале г. г. Белтэрпаб'яднаньне павінна вывезьці з балота 44787 тон здабытага торпу і спажыўцы 114939 тон.

З пастаўленай адказнай задачай не спраўляюцца, аднак, ні Белторп, ні паасобныя спажыўцы: электростанцыі, фабрыкі і заводы. У 4-м квартале вывезена толькі 36885,3 тон торпу, што складае 23,1 проц. квартальнага пляну. За пяцідзёнку, з 1 па 5 сьнежня, сыстэмай Белторпаб'яднаньня з 7-мі торпзаводаў вывезена 19619 тон торпу, гэта значыць 43,8 проц. плянавага заданьня. Вывозкай торпу займаліся выключна заводы, якія маюць мэханізаваны транспорт: Асіторп, Смалявічы і Міхановічы. Астатнія заводы—„Даўмана“, „Закрашынскі мох“, „Чырвоны сьцяг“ і „Пролетары“ яшчэ не пачыналі вывазкі. Завод „Даўмана“ і „Чырвоны сьцяг“ нават не заключылі ўмоў з колгасамі і аднаасобным сэктарам на пастаўку цягавай і рабочай сілы.

Значна горш справа з вывазкай торпу спажыўцамі. Квартальны плян выканан толькі на 15 проц. За першую пяцідзёнку сьнежня вывезена 17266,2 тоны торпу.

З 16 спажыўцоў тарпянага палива вывозяць торп з балота толькі 8. Такі буйны торпзавод, як „Бальшавік“, за першую пяцідзёнку сьнежня ня вывез ніводнае тоны торпу. Ганебна адстаюць заводы: „1-га мая“ (вывез 1,1 проц. квартальнага пляну), „Новая Беларусь“ (0,9 проц.) і „Чырвоны Кастрычнік“ (7,8 проц.)

Усе вышэйадзначаныя заводы забыліся аб тым, што асноўнай, рашучай сілай у вывазцы торпу па сыстэме спажыўцоў зьяўляецца—конь, гужавая сіла. Здавалася-б, што на гэты вучастак зьвернуць максімум увагі, шырока разгорнуць заключэньне ўзаемных дагавароў з колгасам і аднаасобным сэктарам на цягавую і рабочую сілу. На справе-ж маем адваротнае: большасьць спажыўцоў гэтую найважнейшую працу здалі ў палон самацёку.

„Гужавая вывазка ў шмат якіх мясцох зрываецца з-за няўважлівых адносін старшынь сельсаветаў, якія ня выконваюць дырэктыў аб дапамозе больш хуткаму заключэньню дагавароў з колгасамі і аднаасобнікамі на забясьпечаньне вывазкі возчыкамі“.

Згодна пляну, у 4-м квартале неабходна закантрактаваць 4315 возчыкаў, на 1-е сьнежня закантрактавана толькі 878, у тым ліку 334 колгасьнікі. Паданыя лічбы—вынік небальшавіцкай працы і нежаданьня ў новых умовах працаваць па-новаму. Гэтыя заводы нават не змаглі дабіцца поўнага выхаду завербаваных на працу возчыкаў. Фактычна з 878 возчыкаў працуе на вывазцы торпу 367.

Плян вывазкі торпу ў 4 квартале знаходзіцца пад пагрозай зрыву. 23,1 проц. вывазкі торпу як Белторпам, так і спажыўцамі—вынік панаваўшай абязьлічкі, якая заняла пачэснае месца ў гэтай працы. У свой час „Чырвоная Зьмена“ сыгналізавала аб абязьлічаных загадах Белторпу і ВСНГБ, аб блытаніне ў вывазцы торпу і безадказнасьці. Цяпер гэты недахоп ліквідаваны: унесена яснасьць, устаноўлена пэрсанальная адказнасьць за транспорт торпу.

Ня менш важнай прычынай зьяўляецца яшчэ і тое, што магчымасьці частковай мэханізацыі вывазкі торпу не скарыстоўваюцца. Плянава не прадугледжана вывазка трактарамі і аўтотранспортам, не заключаны дагавары з колгасамі і МТС, і нарэшце, не выкарыстоўваюцца на вывазцы торпу ўласныя трактары торпазаводаў.

Гэта трэба ўлічыць. Мэханізацыі даць пашпарт на балота—адна з рашаючых умоў.

Крыху лепш з падрыхтоўкаю балот да новага торпсэзону. Аднак і тут ня ўлічаны ўрокі мінулага году. Плян падрыхтоўчых работ па пракопцы каналаў выканан на 51, 1 проц., па карчоўцы на 65,5 проц. плітоўцы 43,5 проц. і адчосу на 46 проц. Такім чынам плян торпздабычы ў 4-м, заключным годзе пяцігодкі знаходзіцца пад пагрозаю зрыву.

Заводы «Чырвоны тарпянік“, „Закрашынскі мох“, „Новая Беларусь“, „Чырвоны Кастрычнік“, „Свабода“ і „Зьвязда“, па бальшавіцку ўзяўшыся за падрыхтоўку балот і ўлічыўшы ўрокі мінулага году, выканалі поўнасьцю плян канальных работ.

У гэтай працы адстаюць заводы: „Чырвоны сьцяг“—31 проц., „Бальшавік“—23,2 проц., „Чырвоная Беларусь“—36,6 проц., „Асіторп“ —43 проц. Па карчоўцы балота плян выканалі толькі 8 заводаў і па плітоўцы 11 заводаў.

Асабліва рашаючы вучастак у падрыхтоўцы балот—гэта карчоўка і ачос вучасткаў, прызначаных для фрэзэрнай здабычы торпу. Тут ня ўсё ў парадку: плян ачосу выканалі 4 заводы. Ганебна адстаюць: „Чырвоны сьцяг“—6,66 проц., Смалявічы—31 проц. „Чырвоная Беларусь—86,6 проц., „Шлях соцыялізму“—63 проц. і „Асіторп“—50 проц.

За месячнік штурму на вывазцы торпу і падрыхтоўцы да сэзону 1932 году комсамольскія організацыі торпазаводаў павінны ліквідаваць прарыў. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на забясьпечаньне торпзаводаў возчыкамі, дабіцца поўнага выхаду закантрактаваных возчыкаў, усямерна дамагацца мэханізацыі вывазкі праз скарыстаньне трактароў, аўтотранспарту і г. д. Месячнік штурму павінен зьявіцца вытворчым экзаменам, праверкай баяздольнасьці кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца паасобку.

М. П.

СУСЬВЕТНЫ КРЫЗІС І БАРАЦЬБА СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

(З дакладу акадэміка т. ВАРГІ ў доме Комасьветы)

Разглядаючы сусьветны экономічны крызіс т. Варга асьвятліў пытаньне агульнай характарыстыкі капіталістычнага крызісу, новы этап паглыбленьня крызысу, бягучы момант крызісу, магчымасьць капіталістычнага выхаду з крызісу, пытаньне вайны і інтэрвэнцыі і барацьбу сусьветнага пролетарыяту за рэволюцыйны выхад з крызісу.

Экономічны крызіс ахапіў усе галіны прамысловасьці ва ўсіх капіталістычных краінах

Сучасны экономічны крызіс капіталізму зьяўляецца самым зацяжным, самым глыбокім і самым вострым з усіх крызісаў, які перажываў калі небудзь капіталізм, крызіс ахапіў усе галіны вытворчасьці і ўсе капіталістычныя краіны. Францыя, якая больш усіх супраціўлялася крызісу, цяпер усё больш падпадае ўсім вынікам крызісу. Зьмяншэньне аб'ему вытворчасьці, зьмяншэньня продукцыі ... ва падкрэсьліваюць глыбіню су... га крызісу. Амэрыканская стальная прамысловасьць у апошняе паўгодзе працуе з нагрузкай 27-30-32 проц.

Вял зарнае падзеньне цэн (да таго-ж падзеньне вельмі нераўнамернае), агромністая колькасьць банкроцтваў, якія даходзяць да камандных вышынь монополістычных аб'яднаньняў, выразна гавораць аб вялізарнай астраце сучаснага крысісу. Астрыню яго паказвае агромисты, нячуваны дэфэцыт бюджэтаў усіх краін. ПАЗШ у першыя пяць месяцаў бягучага году маюць дэфэцыт у 600000000 доляраў, Такое-ж становішча і ў іншых краінах, як Нямеччына, Італія, Ангельшчына і г. д. Інфляцыя ахапіла прыблізна больш паловы сьвету, і валюта такіх першаклясных дзяржаў, як Ангельшчына, на працягу двух месяцаў упала на 40 проц.

Загніваньне капіталізму дашло да таго, што капіталізм больш ня можа выкарыстаць тыя вытворчыя сілы і матэр'яльныя і людзкія, якія ён сам стварыў.

Аграрны крызіс—частка агульнага экономічнага крызісу

Аднэй з частак агульнага крызісу зьяўляецца хронічны аграрны крызіс, які пераплятаецца з прамысловым крызісам. Адбываецца масавы развал, масавае зьнішчэньне сярэдняга сялянства, часткі кулацка-заможнага і нават памешчыкаў, якія ня маюць магчымасьці купляць дарагія машыны, каб быць конкурэнтна-здольнымі

Больш за ўсіх пакутуе ад крызісу пролетарыят, што выражаецца ў нячуваным беспрацоўі. У пачатку сьнежня бягучага году Нямеччына мела 5 мільёнаў 57 тысяч беспрацоўных. Прыблізна тое-ж у Амэрыцы, Ангельшчыне і іншых меншых краінах, як Польшча. У Нямеччыне у 1931 г. адразу звольнена 7000 настаўнікаў, а ў аднэй з тэхнічных ВНУ Нямеччыны ніводзін са скончыўшых у 1930 годзе не знайшоў працы. Вось тая соцыяльная аснова насьпяваньня рэволюцыйнага крызісу.

Фінансавы крызіс самы важны момант этапу новага экономічнага крызісу

Самы важны момант новага этапу паглыбленьня крызісу гэта—фінансавы крызіс, які ахапіў увесь сьвет. Усеагульны крэдытны крызіс; ніхто нікому ня можа даць крэдытаў. Людзі ня вераць банкам і забіраюць грошы. Банкі лопаюцца. Людзі бяруць з банкаў золата і хаваюць яго.

Фінансавы крызіс выклікаў новы наступ на рабочую клясу. У Амэрыцы 1-га кастрычніка на 10 проц. зьменшана зарплата ўсім рабочым і служачым цяжкой індустрыі. У Ангельшчыне адначасна ідзе наступ на рабочую клясу з 3-х бакоў: падзеньне фунта, новая таможная сыстэма, непасрэднае зьніжэньне заработку, а таксама і павялічэньне працоўнага дня. Некалькі дзён назад ангельскія прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасьці патрабавалі павялічыць працоўны тыдзень ад 48 да 52 гадзін, зьменшыць зарплату, патрабавалі, каб замест 6-ці станкоў рабочы абслугоўваў 8 станкоў.

Вось конкрэтных адзнак, што крызіс ідзе да канца знайсьці нельга. Гнілая, часовая і частковая стабілізацыя зьнікае па меры разьвіцьця рэволюцыйнага крызісу, які насьпявае ў розных краінах у розных ступенях. Капіталістыя адчуваюць гэтую вялікую небясьпеку. Мусоліні—правадыр італьянскіх фашыстых—піша:—„Я не належу да людзей, якія любяць пераўвялічваць трагічны бок становішча, але я павінен папярэдзіць усіх тых, каму дарагі інтарэсы чалавецтва, што яшчэ адна зіма галечы і нястатку можа аддаць Эўропу ва ўладу комунізму". Такіх прароцтваў можна прывесьці дзесяткі. Яны маюць мэту мобілізаваць сілы буржуазіі для выратаваньня капіталістычнага ладу, але яны і паказваюць, што самі правадыры капіталістычнага сьвету адчуваюць небясьпеку, якая пагражае капіталізму.

Далей дакладчык шырока асьвятліў пытаньні капіталістычнага выхаду з крызісу, пытаньні рэволюцыйнага выхаду з крызісу і наогул пытаньні барацьбы сусьветнага пролетарыяту.

Палітычная шкоднасьць і тэорэтычная памылковасьць пагляду, што няма капіталістычнага выхаду з крызісу

Некаторыя таварышы (Прэабражэнскі, а хто колечы і з брацкіх компартый) сьцьвярджаюць, што з гэтага крызісу капіталістычнага выхаду няма. Яны тэорэтычна памыляюцца і робяць шкодную палітычную паслугу рэволюцыйнаму рабочаму руху... „Левыя" соцыял-дэмократы, зьяўляючыся самым небясьпечным крылом соцыял-фашыстых, таксама аплакваюць магчымасьць капіталістычнага выхаду з крызісу, хаця яны ўсімі сіламі супрацьстаяць компартыям, якія працуюць над рэволюцыйным выхадам з крызісу. Палітычная шкоднасьць сьцьвярджэньня, якое гучыць вельмі радыкальна і рэволюцыйна, што капіталістычнага выхаду з сучаснага крызісу няма заключаецца ў тым, што гэта паслабіць рэволюцыйны рух рабочых, бо пасіўнасьць на зьвяржэньне буржуазіі, бо рабочы будзе думаць, што ўсёроўна капіталістычны выхад немагчымы.

Вайна—адзін з капіталістычных выхадаў з сучаснага экономічнага крызісу

Відавочна, абвастрэньне супярэчнасьцяў унутры імпэрыялістычных дзяржаў у выніку крызісу тым больш абвастрае супярэчнасьці між СССР і капіталістычным сьветам. Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі і набачаньне тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва яшчэ ніколі не рабілі такога ўплыву на рабочую клясу ўсяго сьвету, які наглядаецца зараз. Прыклад СССР паказвае рабочым усіх краін, што задача зьвяржэньня ўлады буржуазіі і заваяваньне ўлады рабочай клясай не зьяўляецца задачай, як кажуць соцыял-фашыстыя нейкай туманнай будучыні, а гэта ёсьць задача, якая можа быць вырашана ў даную гістарычную эпоху. Па-другое соцыялістычнае паказваньне, што рабочая кляса можа ўладаць усімі вытворчымі сіламі, якія стварыў капіталізм. Па-трэцяе розьніца ў становішчы рабочае клясы—беспрацоўе. Там кожны трэці рабочы—беспрацоўны, а ў нас недахоп рабочай сілы. Там сільнае зьмяншэньне зьдзяшэньне ўзроўню рабочае клясы, у нас пасьлядоўнае і вялікае павялічэньне матэр'яльнага і вельмі больш культурнага становішча. Гэта адносіцца і да сялянства, да прыгнечаных народаў і г. д. І таму для буржуазіі існаваньне і разьвіцьцё СССР робіцца ўсё больш і больш не падсілу. Усё больш і больш узрастае жаданьне нясправіцца напад і зьнішчыць СССР. Захоп Японіяй Маньчжурыі—частка ў падрыхтоўцы ваеннай інтэрвэнцыі у СССР. Буржуазны друк адкрыта заяўляе, што крызіс можа зьлікнуць адразу толькі б пачалася вайна. І вось гэты момант небясьпекі інтэрвэнцыі паказвае, што пролетарыяту ўсяго сьвету неабходна рыхтавацца да рэволюцыйнага выхаду з крызісу.

Узмацненьне рэволюцыйнага руху сярод рабочых і сялянства ставіць перад брацкімі компартыямі задачу: усю магчымасьць гэты рэволюцыйны рух на зьвяржэньне ўлады буржуазіі.

Магчымасьць рэволюцыйнага выхаду з крызісу ў сучасны момант большая, чым у 1921 г.

Відавочна,—кажа дакладчык у адказах на запытаньні,—што магчымасьць рэволюцыйнага выхаду ў сучасны момант куды большая, чым яна была ў 1921 годзе, бо сучасны крызіс куды глыбейшы і сільнейшы, чым крызіс 1920-21 году. Цяпер мы маем зусім іншае ў становішчы Савецкага Саюзу У 1921 годзе соцыял-фашыстыя гаварылі рабочым, што рэволюцыйны выхад з крызісу азначае голад і галечу. Зараз яны гэтага сказаць ня могуць. Знаходзяцца толькі старыя цурні як Каўцкі, які я гэтым займаюцца. Але такая агітацыя нічога ня дасьць, бо рабочыя ведаюць аб посьпехах нашага соцыялістычнага будаўніцтва, аб посьпехах выкананьня пяцігодкі.

Аднэй з важных прадпасылак рэволюцыйнага выхаду з крызісу зьяўляецца крызіс у радох соцыялфашысцкіх партый. У „рабочай" партыі Ангельшчыны мы маем вялізарны раскол там фактычна ёсьць 4 партыі: партыя Макдональда, Гендэрсона, незалежная рабочая партыя і амаль фашысцкая партыя. Прыглядаючыся да Нямеччыны бачым, што там таксама адбыўся раскол, там мы наглядаем пераход старых соцыял-дэмократычных рабочых у лягер комуністых. Самая надзейная апора буржуазіі—соцыял-фашыстыя—па ўсіх краінах траціць сваю сілу. Адваротнае мы наглядаем у радох комуністычных партый.

Калі ўзяць факт існаваньня Савецкага Кітаю і тое, што ў раду колёніяльных краін мы маем моцныя комуністычныя партыі і дзесяцігадовы вопыт барацьбы Комінтэрну, дык зусім відавочнай становіцца магчымасьць рэволюцыйнага выхаду з крызісу. Ад так званых суб'ектыўных фактараў часта залежыць у першую чаргу посьпех барацьбы за ўладу.

У радзе капіталістычных краін рэволюцыйны выхад з крызісу будзе ў значнай меры залежаць ад таго, на якой вышыні будуць стаяць комуністычныя партыі ў барацьбе за пролетарскую рэволюцыю.

БЕЛТА

Крызіс у Польшчы

Колькасьць апротэставаных вэксалёў за апошнія 3 м-цы павялічылася на 15 млн. злотых

ВАРШАВА 13. Паводле офіцыйнай польскай статыстыкі, у Польшчы за 1931 г. апротэставана вэксалёў на 996 млн. злотых.

За апошнія 3 м-цы 1931 г. вэксалёў апротэставана на 315 млн злотых. У параўнаньні з мінулым годам колькасьць апротэставаных вэксалёў павялічылася на 15 млн. злотых.

Новы катаржны прысуд

БЕЛАСТОК 13. Беластоцкі акруговы суд на выязной сэсіі ў Бельску-Падляскім разглядаў справу селяніна Сьцяпана Амальяніка з вёскі Сыпня, Бродзінскай гміны, Беластоцкага павету. С. Амальянік абвінавачваецца ў прыналежнасьці да КПЗБ і ў распаўсюджваньні комуністычнай літаратуры.

Фашысцкі суд прыгаварыў Амальяніка да 4 год катаргі з пазбаўленьнем усіх грамадзкіх правоў.

Сялянская маемасьць у ЗБ ідзе пад ліцытацыю

ВІЛЬНЯ, 12. Як паведамляюць віленскія газэты, за апошнія 3 месяцы г. г. у Віленшчыне аддана пад ліцытацыю (на продаж з аукцыёну) 100 сялянскіх гаспадарак.

Такі масавы распродаж сялянскай маемасьці тлумачыцца тым, што сяляне не здалелі аплаціць накладзеныя на іх падаткі, якія ў значнай меры перавышаюць вартасьць іх гаспадарак.

У конкурс ня ўключыліся

* Комсамольская ячэйка ў Гомельскім тэхнолёгічным тэхнікуме грамадзкага харчаваньня ня ўключылася ва ўсесаюзны стралковы конкурс. Ваенорг, а таксама ячэйка Асоавіяхэму ніякай вайсковай работы сярод комсамольцаў і беспартыйных студэнтаў у тэхнікуме не праводзіць.

К-к

На шахматна-шашачным фронце

Правядзем упяршыню ў гісторыі шахмат матч разьвязаньне задач

З мэтай выявіць удзельнікаў матчу паміж „Ч. З." і часопісам „Смена" на разьвязаньне шахматных задач, рэдакцыя абвяшчае конкурс на разьвязаньне аднэй задачы.

Усе таварышы, якія правільна разьвяжуць задачу, будуць уключаны ў склад каманды „Ч. З." для матчу з часопісамі „Смена", Арбэйтэр ілюстрыртэр цэйтунг" (Нямеччына). Разьвязак задачы трэба даслаць па адрасу «Чырвонай Зьмены", да 25 сьнежня.

Конкурс, а таксама матч з часопісамі дасягнуць сваёй мэты толькі ў тым выпадку, калі ў іх прыме ўдзел уся рабочая моладзь, якая ўмее іграць у шахматы. Комсамольскія ячэйкі павінны папулярызаваць конкурс, давесьці аб ім да ведама ўсёй моладзі.

Ніводнага комсамольца шахматыстага, ніводнага маладога працоўнага шахматыстага па-за ўд... у конкурсе!

Судзьдзёю конкурсу зац... джан т. Мазэ...

Конкурсная зада...

Хто разьвяжа?

белыя Крс2. Лв2... (2)
чорныя: Кра1. Кс1... (2)
мат у 2 хады

Папраўкі

У № 282 ад 8 сьнежня па недагляду выпускаючага дапушчаны памылкі: на першай старонцы у перадавой, у трэцім абзацы, павінна быць: „Партыйная організацыя Гомельскага вузла змагла па-бальшавіцку паставіць" і г. д.; на другой старонцы ў артыкуле „За карэнную перабудову", ў другой колёнцы. другі абзац зьверху, павінна быць: „першым перайшоў на гаспадарчы разрахунак і паказаў яго эфэктыўнасьць".

***

У № 283 ад 9 сьнежня на першай старонцы ў перадавой „Нанесьці руйнуючы ўдар клясаваму ворагу" ў другім абзацы павінна быць: „З краіны адсталай, дробна таварнай аграрнай у краіну індустрыяльна-аграрную" і г. д.

**

У № 285 ад 12 сьнежня па віне выпускаючага Шапіро І. на другой старонцы да матар'ялаў аб збожжа-нарыхтоўках увізе перадавіцы да гэтых матар'ялаў зьмешчана перадавая аб вайсковай рабоце, якая ня мае ніякага дачыненьня да гэтых матар'ялаў і не павінна быць зьмешчанай у гэтым нумары газэты.

***

У № 287 ад 14 сьнежня па ... выпускаючага і корэктуры ... шчаны памылкі: на першай ... ронцы ў загалоўку да матар'ялаў ... цоўкі лёну надрукавана: „Не ... ку лёну—злачынства перад ... вай". Павінна быць: „Неапо... лёну—злачынства перад дзярж...

На трэцяй старонцы ў арты... „Клічам на баявы агляд" у д... колёнцы павінна быць: „Чырвоня... на" ўключаецца ў творчы агляд ... дзёжнай літаратуры прыступ... яго практычнага правядзеньня. У ... цяй колёнцы гэтага артыкула над... вана; „Не павінна стаяць у бак... агляду комсамольскай старонкі ... вая і фабрычна-заводзкія газ... Павінна быць: „Не павінны ст... баку ад агляду комсамольская ст... кі раённых і фабрычна-заводзкіх ... зэт".

Увага: за дапушчэньне ўсіх ... памылак Шапіра І. зьняты з раб...

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛ...

Усебеларуская нарада па пытаньнях кадраў

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б,

на 5-га студзеня 1932 г. у Менску

СКЛІКАЕЦЦА

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ КАДРАЎ

У парадку дня нарады стаяць наступныя пытаньні:

1. Вынікі і чарговыя задачы выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па пытаньнях кадраў.
2. Кантрольныя лічбы па кадрах на 1932 г.
3. Становішча ВТНУ і ВНУ БССР і пляны іх разьвіцьця на бліжэйшы пэрыод.
4. Аб падрыхтоўцы масавых колгасных кадраў.

Акрамя таго, у сэкцыях нарады будуць прапрацаваны наступныя пытаньні:

а) аб сыстэме разьмеркаваньня кадраў і стварэньні рэзэрваў;
б) Аб падрыхтоўцы кадраў для тарпянай прамысловасьці на 1932 год;
в) аб падрыхтоўцы кадраў для прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў на 1932 год;
г) аб падрыхтоўцы саўгасных, жывёлагадоўчых і ільнаводных кадраў;
д) аб падрыхтоўцы кадраў сельсаветаў;
е) аб падрыхтоўцы кадраў спажывецкай коопэрацыі;
ж) аб рабоце райкомаў у галіне кадраў.

На нараду выклікаюцца загадчыкі аддзеламі кадраў ГК, загадчыкі оргаддзелаў 45 райкомаў, дырэктары і сэкратары парткалектываў, ВТНУ і ВНУ, 10 дырэктароў тэхнікумаў, 8 дырэктароў прамысловасьці і новабудоў, 10 дырэктароў саўгасаў, 10 работнікаў па кадрах сыстэмы Колгасцэнтру і Трактарацэнтру і кіраўнікі аддзеламі кадраў усіх цэнтральных устаноў.

Для падрыхтоўкі гэтай нарады сэкратарыятам ЦК вылучана спэцыяльная камісія.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Друкарня імя тав. Сталіна.
Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.